Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№201 (28565)

18 КАСТРЫЧНІКА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 9–16



У вас празмерная трывожнасць?

СТАР. 5



Поўны асартымент

МС



Апавяшчальнік для ветэрана

МС

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КАРАГІН, старшыня прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва:**

*«Многія нашы прапановы знайшлі падтрымку ва Указе №376 «Аб мерах па ўдасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці», які падпісаны Прэзідэнтам 16 кастрычніка. Ён ствараўся складана, але Камітэт дзяржкантролю, Мінэканомікі і МАРГ былі на баку разняволення дзелавой ініцыятывы і зніжэння прадпрымальніцкай рызыкі. Прыняты ўказ — гэта карысны дакумент і важны крок у бок падтрымкі тых суб'ектаў, якія вядуць канструктыўную гаспадарчую дзейнасць. Для мінімізацыі магчымых парушэнняў будзе весціся папераджальная і прафілактычная работа. Трэба ў першую чаргу растлумачваць і дапамагаць пазбегнуць памылак пры вядзенні прадпрымальніцкай дзейнасці, а не караць, што з'яўляецца пазітыўным сігналам для бізнесу».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.10.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9592 | ▲ |
| Еўра | 2,3064 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0341 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0740 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ТАЦЦЯНІН ДЗЕНЬ



Таццяна ДЗЯНІСАВА-БЕРАШЭВІЧ з вёскі Цыганкі Сенненскага раёна працуе сацыяльным работнікам. А яшчэ яна старэйшына ажно пяці невялікіх вёсак. Наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук правёў з гэтай жанчынай, якую заўсёды чакаюць, яе працоўны дзень. Чытайце і глядзіце яго фотарэпартаж у новым выпуску «Мясцовага самакіравання».

■ Жыць цікава!

## «АБСТАЎЛЮ ЛЮБОГА МАЛАДОГА!»

### Гісторыі беларусаў, якія працуюць пасля 90 гадоў

**«Інтэрв'ю? Ну, толькі калі хутка, а то ў мяне вельмі шмат работы», — сказаў адзін з нашых герояў, калі тэлефанавалі дамовіцца на сустрэчу. А яму, між іншым, 94 гады! У Беларусі 21 чалавек працягвае працаваць пасля 90. Пра выбар прафесіі і навуковыя дасягненні, сакрэт даўгалецця і ранішнюю фізкультуру расказалі вядомыя медык і акадэмік, якім узрост — не перашкода.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Прафесар Леанід Сцяпанавіч Вялічка: «Пытаюцца, чаму на пенсію не сыходжу. Дык цяпер рай для спецыялістаў!»

### «Машыну перастаў вадзіць толькі ў красавіку»

**Леаніду Сцяпанавічу ВЯЛІЧКУ, прафесару кафедры артапедычнай стаматалогіі БДМУ**, 92 гады. Яшчэ да сёлетняга мая ён — пратэзіст па спецыяльнасці — прымаў пацыентаў. Цяпер займаецца навуковай і метадычнай работай, часам вядзе заняткі ў студэнтаў.

У медыцыну Леанід Сцяпанавіч прыйшоў 70 гадоў таму. Адвучыўся ў Мінскай зубаўрачэбнай школе і паехаў па размеркаванні ў родны Старобін.

СТАР. 4

## АД БЛУЗ І КАРТАК ДА АЛЕЮ І ПІЛОВАЧНІКА

### Што набываюць на айчыннай таварнай біржы?

**Апошнія гады сусветны інтэрнэт-гандаль перажывае бум: кожны дзень з'яўляюцца сотні новых анлайн-пляцовак, маркетплэйсаў, на якіх можна купіць або прадаць усё што заўгодна і ў любой колькасці. Кожны новы гулец на гэтым рынку ўсімі сіламі імкнецца адкусіць хоць бы невялікі кавалак ад гэтага вялізнага пірага. Нягледзячы на канкурэнцыю з боку такіх гігантаў, як Alibaba, Amazon і eBay, не засталася ў баку ад агульнасусветных тэндэнцый і наша краіна. Іх беларуская альтэрнатыва была створана дзякуючы Беларускай універсальнай таварнай біржы (БУТБ).**

Некалькі гадоў таму на біржы з'явілася свая электронная пляцоўка прамысловых і спажывецкіх тавараў (ПСТ). Працуе яна на стыку біржавога гандлю і электроннай камерцыі і з'яўляецца свайго роду гібрыдам біржы і інтэрнэт-партала для аптовых закупак. Таргі тут праводзяцца кругласутачна ў анлайн-рэжыме, а асартымент тавараў абмяжоўваецца толькі фантазіяй і заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб абароце зброі, наркатычных сродкаў, псіхатропаў і іншай падобнай «прадукцыі». Таму на таргі нярэдка выстаўляюцца абсалютна небіржавыя тавары: ліфты, дарожныя знакі, спецвопратка, электраінструменты, прадукты харчавання і многае іншае. Пры гэтым у сілу таго, што пляцоўка ПСТ арыентавана на аптовы гандаль, сумы здзелак часам аказваюцца значнымі. У БУТБ «Звяздзе» расказалі пра пяць найбуйнейшых здзелак гэтага года з незвычайнымі для біржавых таргоў таварамі.

СТАР. 3